Справаздача
па дзейнасці Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г.Мінска» за 2020-2021 навучальны год

На працягу 3-х гадоў (з 2018 году) дзяржаўная ўстанова адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г.Мінска» працуе ў статусе Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» (далей – гарадскі рэсурсны цэнтр па выхаваўчай рабоце, РЦ).

Гарадскі рэсурсны цэнтр па выхаваўчай рабоце – гэта трансляцыя і распаўсюджванне эфектыўнага педагагічнага вопыту работы па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню школьнікаў, студэнтаў і працоўнай моладзі, а таксама актывізацыя дзейнасці творчых калектываў Кастрычніцкага раёна і горада Мінска сродкамі розных відаў традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў.

З 2015 па 2020 год у аснове дзейнасці Рэсурснага цэнтра ляжыць рэалізацыя раённай адукацыйна-культурнай праграмы «Традыцыйная культура і моладзь». Праграма аб’яднала больш за 18 школ і гімназій Кастрычніцкага раёна і сталіцы, а таксама больш за 20 творчых калектываў з розных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь.

Высокая і рэзультатыўная дзейнасць раённай адукацыйна-культурнай праграмы «Традыцыйная культура і моладзь» была прадстаўлена на Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура: педагагічны кантэкст» (арганізатары – ЦДАДіМ «Ветразь», НЦМТДіМ, БДУКМ) – 17 лістапада 2020 года.

Мэтамі канфэрэнцыі выступілі абагульненне і трансляцыя інавацыйнага вопыту ў рэалізацыі прыярытэтных праектаў і праграм у галіне этнакультурнага выхавання падрастаючага пакалення ва ўмовах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, абмеркаванне сучасных метадалагічных падыходаў і перспектыў у выхаванні, развіцці, сацыялізацыі асобы сродкамі традыцыйнай культуры беларусаў, удасканаленне этнакультурных кампетэнцый педагагічных работнікаў, развіццё медыякультуры як кампаненту сучаснай адукацыйнай прасторы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Канферэнцыя прайшла з выкарыстаннем сучасных сродкаў анлайн-падключэння: платформа для правядзення канферэнцый ZOOM, сацыяльная сетка «Instagram”, афіцыйныя інтэрнет-сайты ўстаноў, відэахосцінг YouTube, дзе быў прадстаўлены вопыт дзейнасці больш за 60 адукацыйных устаноў нашай краіны.

Удзельнікаў канферэнцыі віталі Н.В. Васільчанка, дырэктар Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, старшыня

рэспубліканскага савета па пытаннях дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, Н.К. Катовіч, начальнік упраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, В.М. Румава, дырэктар Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г.Мінска. Канферэнцыя аб’яднала звыш 120 удзельнікаў з розных куткоў Рэспублікі Беларусь.

З пленарнымі дакладамі выступілі Н.В. Васільчанка, дырэктар Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, В.М. Румава, дырэктар Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г.Мінска, Л.І. Казлоўская, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар, загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, Т.А. Пладунова, дацэнт кафедры этналогіі і фальклору, Н.В. Петухов, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры.

У межах канферэнцыі былі арганізаваны 3 тэматычныя секцыі, практыкаарыентаваная пляцоўка «Прамы эфір-дыскусія «З учора – у сёння!»: вынікі рэалізацыі раённай адукацыйна-культурнай праграмы «Традыцыйная культура і моладзь», інтэрнэт-панарама педагагічнага вопыту і творчасці навучэнцаў, якая ўключае майстар-класы, творчыя майстэрні, рэканструкцыі абрадаў, відэаагляды выставак дэкаратыўна-прыкладной творчасці, відэапрэзентацыі творчай дзейнасці і тэматычныя заняткі, відэаролікі з дэманстрацыяй узораў музычнага і гульнёвага фальклору.

На выніковым паседжанні была выпрацавана рэзалюцыя, якая прадугледжвае далейшае супрацоўніцтва і ўзаемаабмен вопытам .

Па выніках канферэнцыі выдадзены зборнік тэзісаў удзельнікаў рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура: педагагічны кантэкст».

Дадзеная канферэнцыя з’явілася вынікам 5-цігадовай плённай дзейнасці раённай адукацыйна-культурнай праграмы «Традыцыйная культура і моладзь». Разам з тым сістэмаўтваральныя праекты, конкурсы і фестывалі працягваюць рэалізоўвацца ў рамках Рэсурснага цэнтра. Напрыклад, III адкрыты конкурс чытальнікаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак» і Тыдзень беларускай мовы і культуры (4-ы год) з поспехам прайшлі ў лютым 2021 года.

У кастрычніку 2020 года, у анлайн-фармаце адбыўся чарговы каардынацыйны савет з намеснікамі дырэктараў устаноў адукацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска на тэму «Патрыятычнае выхаванне асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў», дзе абмяркоўваліся пытанні выканання і рэалізацыі плана дзейнасці Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце за мінулы год і анансавалася як культурна-масавыя, так і мерапрыемствы наступнага навучальнага года.

У рамках адукацыйнай дзейнасці цэнтра «Ветразь» па дадзенаму выхаваўчаму кірунку педагог дадатковай адукацыі Снітко Марыя Васільеўна, кіраўнік фальклорнага калектыва «Мілавіца» аддзялення інавацыйнага развіцця, працуе па праграме аб’яднання па інтарэсах на павышаным узроўні

ў рамках эксперыментальнага праекта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Апрабацыя мадэлі развіцця прафесійнага самавызначэння навучэнцаў праз рэалізацыю праграм аб'яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю на павышаным узроўні». Вынікам эксперыментальнай дзейнасці з'явілася ўрачыстае ўручэнне пасведчанняў аб дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі 16 навучэнцам фальклорнага калектыва «Мілавіца».

Дзейнасць Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце ў 2020-2021 навучальным годзе – гэта шырокая рэалізацыя мерапрыемстваў рознага ўзроўню і фармату (анлайн-формы):

*раённы (Кастрычнічкі раён):*

- каардынацыйны савет (анлайн-фармат, платформа ZOOM) «Патрыятычнае выхаванне асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» (кастрычнік, 2020);
- адукацыйна-выхаваўчы праект «Мая Радзіма – маё натхненне» (2020-2021 навучальны год);
- мерапрыемствы і абрадавыя святы «Божая Барада», «Прыйшоў Багач – кідай рагач, бяры сяверньку, і па-маленьку», «Каляды», «Масленіца», «Купалле» і іншыя (на працягу перыяду);
- I адкрыты фолькфэст «Ляльнік» (15 мая 2021 года).

*рэгіянальны (г.Мінск):*

- святочны канцэрт, прысвечаны 30-годдзю творчай дзейнасці фальклорнага калектыва «Мілавіца» (кастрычнік, 2020);
- анлайн-семінар (платформа ZOOM) «Кацігарошак: конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы» (лістапад, 2020);
- тыдзень беларускай мовы і культуры «Родная мова: размаўляем, дбаім, паважаем» (люты, 2021);
- III адкрыты конкурс чытальнікаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак» (18 лютага 2021 года);
- II адкрыты чэмпіянат па інтэлектуальнай гульні «Беларускі КВіЗ» (21 лютага 2021 года);
- інтэнсіў-семінар (прамы эфір – инстаграм) «Асаблівасці вясновай абраднасці беларусаў» (сакавік, 2021);
- Гарадскі марафон «Рэсурсны цэнтр па выхаваўчай рабоце запрашае...» (удзел, МГІРА) (на працягу перыяду).

*рэспубліканскі:*

- рэзультатыўны ўдзел у XI Рэспубліканскім конкурсе праграм аб'яднанняў па інтарэсах мастацкага профілю (дэкаратыўна-прыкладны напрамак) «Праграма – Алімп» – Дыплом III ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за распрацоўку праграмы аб'яднання па інтарэсах «Ткацтва» (Ярмалінская М.В., Шмулеўцова І.У.) (кастрычнік, 2020);
- рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Традыцыйная культура: педагагічны кантэкст» (сумесна з НЦМТДіМ, БДУКМ) (17 лістапада 2020 года);
- удзел у адкрытых міжрэгіянальных майстар-класах «Калядна-абрадавая культура беларусаў: традыцыі і сучаснасць» – Молчан С.Ю., Таляронак

А.А., педагогі дадатковай адукацыі АДПТіВМ (відэафармат), Снітко М.В., Касцяневіч Н.У., педагогі дадатковай адукацыі АІР (прамы эфір – інстаграм) (верасень – снежань, 2020);

- удзел у instagram-фэсце «Народны каляндар» (Снітко М.В., Касцяневіч М.У., педагогі дадатковай адукацыі АІР) (на працягу перыяда);
- рэзультатыўны ўдзел у II фестывалі-конкурсе народнай песні імя А.У. Рашчынскага (Снітко М.В. – дыплом II ступені і дыплом за педагагічнае майстэрства, Касцяневіч М.У. – дыплом III ступені) (красавік, 2021).

Працягваецца актыўнае супрацоўніцтва з нашымі партнёрамі:

- ДУА «Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі»;
- ДУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»;
- УА «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;
- УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва»;
- УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя М.Танка»;
- Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту;
- УА «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі»;
- ГА «Беларускі фонд культуры»;
- Дзяржаўныя ўстановы адукацыі Кастрычніцкага раёна г.Мінска.

У 2020-2021 годзе неабходна адзначыць высокую актыўнасць па трансляцыі вопыту Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце:

- прэзентацыя дзейнасці рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце на жнівеньскім форуме педагагічных работнікаў «Мінск – горад, які вучыць, – горад, які вучыцца» (Дом афіцэраў);
- XIX Рэспубліканская выстава навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці навучэнскай моладзі (14-16 красавіка 2021 году): Дыпломы I ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за распрацоўку матэрыялу «Рэспубліканская апорная метадычная пляцоўка «Традыцыйная культура і моладзь» – Румава В.М., дырэктар, Грыцэнка Е.І., намеснік дырэктара, Гнюсевіч І.С., загадчык вучэбна-метадычным кабінетам; Дыплом II ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь - аўтарскі калектыў цэнтра «Ветразь», Дыплом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «за актыўны ўдзел» – цэнтр «Ветразь»; Дыплом I ступені камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама - Меньшыкава М.У., метадыст;
- прэзентацыя дзейнасці Адкрытага конкурса чытальнікаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак» на адзіным выставачным стэндзе камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама ў рамках XIX Рэспубліканскай выставы;
- прэзентацыя матэрыялаў у метадычным флэшбуке #МОЯМЕТОДИЧЕСКАЯРАЗРАБОТКА (НЦМТДіМ) у рамках XIX Рэспубліканскай выставы;
- гарадское свята «Тры гадзіны па роднай краіне» – інтэрактыўная пляцоўка «Беларусь аўтэнтычная» (прэзентацыя дзейнасці) (1 чэрвеня 2021 года).

А таксама трансляцыя ў СМІ:

| № | Назва артукула | Назва часопіса, газеты (№ часопіса) | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога-аўтара |
|---|---|---|---|
| 1 | Культурнае выхаванне (Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Традыцыйная культура: педагагічны кантэкст”) | Настаўніцкая газета №132, 2020 | |
| 2 | Шлях, з якога нельга сасупіць (Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Традыцыйная культура: педагагічны кантэкст”) | Минская школа сегодня, №12, 2020 | |
| 3 | С красками по жизни (Рубченя Н.Ц.) | Вечерний Минск, №3, 21 студзень, 2021 | |
| 4 | Магічнае, дарагое, важнае (III адкрыты конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы “Кацігарошак”) | Настаўніцкая газета №20, 20 лютага, 2021 | |
| 5 | Запрашэнне ў беларускасць (III адкрыты конкурс апавядальнікаў беларускай народнай прозы “Кацігарошак”) | Минская школа сегодня, №3, 2021 | |
| 6 | Хвалі карагодаў і лінія жыцця (70 год М.А. Козенка –этнахарэограф фальклорнага калектыва “Мілавіца”) | Краязнаўчая газета, №10, сакавік, 2021 | Вячаслаў Калацэй, загадчык кафедры этналогіі і фальклору і Цэнтра нематэрыяльнай культурнай спадчыны БДУКМ |
| 7 | Як я на танцавальную вечарыну завітала (70 год М.А. Козенка –этнахарэограф фальклорнага калектыва “Мілавіца”) | Краязнаўчая газета, №13, красавік, 2021 | Лізавета Рэут, удзельніца фальклорнага калектыва «Мілавіца» цэнтра «Ветразь» |
| 8 | Традыцыі і святы маёй краіны (культурна-выхаваўчая праграма) | Выхаванне і дадатковая адукацыя, №6, 2021 | А.І. Грыцэнка, намеснік дырэктара цэнтра «Ветразь», Н.У. Касцяневіч, кульарганізатар цэнтра «Ветразь» |
| 9 | Ідзе Багач чыстымі нівамі (фальклорнае свята): шчодры Багач (фальклорна-забаўляльная праграма) | Выхаванне і дадатковая адукацыя, №8, 2021 | А.І. Грыцэнка, намеснік дырэктара цэнтра «Ветразь», Н.У. Касцяневіч, кульарганізатар цэнтра «Ветразь» |

З мэтай абагульнення і распаўсюджвання педагагічнага вопыту па дзейнасці РЦ функцыянуе тэматычны сайт «Традыцыйная культура і моладзь» http://tk.oktcvr.minsk.edu.by, вядзецца старонка ў Instagram «@vetraz_official», Telegram-канале «Ветразь» – для ўсіх, «Ветразь» – для кожнага» і YouTube – канал «Ветразь», дзе кожны можа паглядзець прамыя эфіры семінараў і абрадаў, а таксама выкарыстоўваць матэрыялы

відеазаняткаў для арганізацыі навучальнага працэсу і выхаваўчых мерапрыемстваў у сваёй педагагічнай дзейнасці.

У 2020-2021 навучальным годзе аформлены і выдадзены інфармацыйна-метадычныя матэрыялы: кніга «Многіе лета» (ды 30-годдзя фальклорнага калектыва «Мілавіца», зборнік «III адкрыты конкурс выканаўцаў беларускай народнай прозы «Кацігарошак», зборнік матэрыялаў рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура: педагагічны кантэкст», досвед працы «Рэспубліканская апорная метадычная пляцоўка «Традыцыйная культура і моладзь», «Анаціраваны каталог метадычных матэрыялаў рэспубліканскай апорнай метадычнай пляцоўкі «Традыцыйная культура і моладзь», абноўлены буклеты калектываў і буклеты гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце; распрацаваны і выраблены інфармацыйна-рэкламны банэр сістэмаўтваральнага конкурсу «Кацігарошак», рыхтуецца да выдання зборнік метадычных распрацовак Тыдня беларускай мовы і культуры; афармляюцца электронныя каталогі дзіцячых работ і праектаў дадзенага кірунку.

Такім чынам, практычная і дзейсная рэалізацыя мерапрыемстваў Гарадскога рэсурснага цэнтра па выхаваўчай рабоце «Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў» спрыяе  фарміраванню грамадзянскіх і патрыятычных якасцяў,  самаўдасканалення ў кірунку «традыцыйная народная культура беларусаў» як падрастаючага пакалення, так і педагогаў, законных прадстаўнікоў навучэнцаў.

Дырэктар ЦДАДіМ «Ветразь» г.Мінска В.М. Румава

Загадчык вучэбна-метадычным
кабінетам цэнтра «Ветразь»,
кіраўнік рэсурснага цэнтра
па выхаваўчай рабоце І.С. Гнюсевіч